РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
19 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 117 (30505)

ФІНАНСЫ

# ВІРТУАЛЬНЫЯ ПАКУПКІ СТАНУЦЬ БОЛЬШ БЯСПЕЧНЫМІ

**Скарэкціраваны правілы ажыццяўлення аперацый з плацежнымі інструментамі**

У нашай краіне ўносяцца змяненні ў правілы ажыццяўлення аперацый з плацежным праграмным дадаткам і іншымі плацежнымі інструментамі. Такое рашэнне ўступае ў дзеянне з 19 чэрвеня, паведаміла начальнік упраўлення электронных плацежных інструментаў Галоўнага ўпраўлення плацежнай сістэмы і лічбавых тэхналогій Вольга АНТАНОВІЧ.



СТАР. 4

СПАЖЫВЕЦ

# ПАЧАСТАВАЦЦА ДАЗВАЛЯЕЦЦА!

**Сезон клубніц у разгары, нягледзячы на надвор'е**



Фота БелТА.

Нягледзячы на дажджы і даволі халоднае вяснова-летняе надвор'е, на рыначных прылаўках — мора ягад. Клубніцы, паводле нашых назіранняў, бяруць цяпер часцей за астатнія. Зразумела, самы сезон.
Духмяныя, прывабныя, розныя па формах і памеры...
А ці смачныя і колькі каштуюць? Зацікавіліся карэспандэнты «Звязды» і адправіліся на рынкі, каб даведацца.

З 10 гадзін раніцы на сталічным Камароўскім рынку каля прылаўкаў з садавінай, гароднінай і ягадамі чэргі. Прытым гэта не толькі бабулі ды дзядулі, але і маладыя людзі з шоперамі. Абышоўшы некалькі радоў, бачым, што хтосьці з прадаўцоў спецыялізуецца на продажы ў цэлым ягад і садавіны, хтосьці — выключна на клубніцах і чарэшні (каля іх асабліва шмат людзей).

Дзе натоўп — туды накіраваліся і мы. У чарзе знаёмімся з 24-гадовай Марыяй, якая загадзя прыгатавала невялікае пластмасавае вядзерца — туды планавала насыпаць набытую ягаду, каб не патаўклася. «Купляю тут клубніцы штогод, — кажа суразмоўніца. — Жыву недалёка, хвілін 15 пешшу, таму і пытання нават не паўстае, дзе свежыя ягады набываць. Планую браць па сярэдняй цане — рублёў за 12».

«Ці смачныя тут?» — пытаецца жанчына, падышоўшы да гэтага гандлёвага пункта. Адказваем станоўча, бо ўжо пачаставаліся ўсімі — ягады не разлезлыя, салодкія, прывезеныя, дарэчы, з Гродна. Прадавец расказала, што папулярнасцю карыстаюцца тры сорты: «Сунічны», «Азія» і «Румба» — каштуюць яны ад 9 да 14 рублёў за кілаграм. Дарэчы, «сунічныя» аказаліся самымі таннымі не толькі тут, але ўвогуле на рынку — іх кошт вагаецца ад 8,5 да 12 рублёў. Прадавец запэўніла, што дробны памер і знешняя неідэальнасць ніяк не ўплываюць на смак ягад гэтага сорту і людзі бяруць з ахвотай. Аднак, кажа яна, гэта не самыя салодкія. Тут прадаюцца клубніцы ў латках і паасобку, цана на якія стартуе ад 12 рублёў. Не танна, але ж... «Як цукеркі!» — звяртаецца да нас прадавец. Брэсцкія грунтавыя ягады каштуюць ад 15 рублёў за кілаграм — сярэдніх памераў, даволі салодкія.

Найбольш дарагія ягады тыя, знешні выгляд якіх набліжаны да ідэальнага: буйныя па памеры, адна да адной, як кажуць. Дыяпазон цэн на такія ягады адпаведна вышэйшы — ад 17 да 23 рублёў. «Крыху падняліся цэны на клубніцы ў параўнанні з мінулым годам, — расказвае прадавец. — Нічога дзіўнага: ягад мала. Вясновыя замаразкі знішчылі палову пасадак. А каб выратаваць тое, што ёсць, гаспадарам давялося працаваць і не спаць начамі.

### Дарэчы

**Закупляюць не танней, чым прадаецца на рынку**

Сёлета на клубніцах можна добра зарабіць і здаўшы ягады нарыхтоўшчыкам. Як паведаміла **прэс-сакратар Белкаапсаюза Таццяна ЛЯШКЕВІЧ**, на 16 чэрвеня закупачная цана на таварныя ягады склала ў межах ад 8 да 14 рублёў за кілаграм у залежнасці ад якасці, памеру, сорту і кан'юнктуры рынку. «На 13 чэрвеня арганізацыямі спажывецкіх кааперацый нарыхтавана 44 тоны клубніц», — паведаміла яна.

### У тэму

На папулярным брэсцкім рынку «Лагуна» цэны на клубніцы 17 чэрвеня ваагаліся ў дыяпазоне ад 15 да 20 рублёў за кіло ў залежнасці ад памераў і выгляду ягады. На Цэнтральным рынку ў Гродне сярэдні стартавы кошт 13 рублёў. Ёсць варыянты за 16, 17 і нават за 23 рублі. Апошняя асабліва буйная. У Гомелі сярэднія кошты: 15–18 рублёў за кілаграм, пабітыя градам ягады прадавалі за 10 рублёў. Кошт буйных і адборных — 20–22 рублі. У Магілёве клубніцы прадаюць па 15 рублёў. У Віцебску — ад 10 да 18. На Чкалаўскім рынку «паўночнай сталіцы» ў выхадныя — ад 15,90 да 19,90 рубля за кілаграм. Мясцовую дамашнюю можна было купіць за 14,50 за паўкіло.

Але наш спажывец любіць родную прадукцыю, гатовы за яе плаціць, і вы гэта бачыце».

І сапраўды, ягады ёсць на любы густ і кашалёк, прычым пераважна беларускай вытворчасці — з Іванава і Бярозы Брэсцкай вобласці, з самога Брэста і Гродна. А роднае і праўда смачнейшае.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

АБІТУРЫЕНТ – 2025

# «НА АДНАГО ВЫПУСКНІКА — АД ТРОХ НАЙМАЛЬНІКАЎ...»

**Аграрная галіна становіцца адной з найбольш высокатэхналагічных у беларускай эканоміцы. Пабывалі ў вядучай ВНУ, дзе рыхтуюць дасведчаных спецыялістаў**

Асаблівасць сельскагаспадарчай ВНУ ў тым, што 70 % яе студэнтаў павінны быць мэтавікі.

Сёння сельская гаспадарка развіваецца сямімільнымі тэмпамі — павялічваецца колькасць МТК з рабатызаванымі даільнымі ўстаноўкамі, укараняюцца спадарожнікавыя тэхналогіі ў земляробстве, аўтаматызуецца сельскагаспадарчая тэхніка. За кошт павышэння тэхналагічнасці заробкі ў гэтай галіне растуць. З атрыманнем жылля ў маладых спецыялістаў таксама няма праблем. Ну чым не пляцоўка для добрага кар'ернага старту?

З 760 чалавек, якіх Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія (БДСГА) збіраецца набраць на дзённую форму навучання, 453, як плануецца, павінны быць абітурыенты-«мэтавікі».



СТАР. 3

Фота БелТА.

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

# ПАЙСЦІ І ВЯРНУЦЦА

**Як не згубіцца ў лесе?**

Штогод дзясяткі, калі не сотні беларусаў губляюцца ў лясах. Адны, паблукаўшы дзве-тры гадзіны, знаходзяць шлях дамоў самастойна. Іншых даводзіцца шукаць усім светам. Нярэдкія сітуацыі, калі лес прачэсваюць і ратавальнікі, і міліцыянеры, і леснікі, і жыхары навакольных вёсак, і валанцёры.

Як адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ**, з пачатку года ў краіне ў прыродных экасістэмах згубіліся 30 чалавек, з іх — пяцёра дзяцей. Знойдзена 29 чалавек, з іх пяцёра дзяцей. «З пачатку лета ў прыродных экасістэмах згубіліся восем чалавек, — удакладніў ён. — Знойдзена сем чалавек».



СТАР. 5




Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года
Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «ГЭТА НЕ ФАРМАЛЬНАСЦЬ, А ШТОДЗЁННЫ ВЫБАР»

**Прэм'ер-міністр уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер**

«Мы адзначаем заслугі тых, хто сваёй працай і талентам штодзень робіць нашу краіну лепш. Кожны з вас не проста выконвае сваю работу, а робіць яе так, што гэта становіцца прыкладам, вартым пераймання і гонару», — падкрэсліў Аляксандр ТУРЧЫН.



Начальнік аддзела кадравай работы Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Юлія МЕЛЕХАВЕЦ атрымала з рук Прэм'ер-міністра медаль «За бездакорную службу» III ступені.

Дзяржаўная ўзнагарода — гэта прызнанне канкрэтных вынікаў, знак павагі вопыту і прафесіяналізму. «Гэта і падзяка вам за вытрымку, вернасць справе, самаадданую і сумленную працу, ад якой залежыць будучыня Рэспублікі Беларусь», — звярнуўся Прэм'ер-міністр да ўзнагароджаных.

Сярод іх, дарэчы, людзі самых розных прафесій: энергетыкі, прадстаўнікі прамысловага комплексу, сельскай і лясной гаспадаркі, дзяржаўныя служачыя.

**«Ваша праца — гэта трывалы фундамент, на якім трымаецца краіна. Вы — найлепшыя з найлепшых. Вы не проста спраўляецеся з пастаўленымі задачамі, вы задаяце планку. Ваш прафесіяналізм — гэта рухаючая сіла нашай дзяржавы», — дадаў Аляксандр Турчын.**

Быць сапраўдным прафесіяналам, працаваць сумленна — гэта не фармальнасць, а штодзённы выбар, які ўзнагароджаныя сёння робяць з гонарам і годнасцю. «Гэтым вы заслугоўваеце павагі ўсёй краіны. Сведчанне — ваша высокая дзяржаўная ўзнагарода», — звярнуў увагу кіраўнік урада.

На заканчэнне Аляксандр Турчын выказаў упэўненасць у тым, што гэта ўзнагарода — не апошняя ў жыцці ўдзельнікаў мерапрыемства. «Яшчэ наперадзе ў нас разам шмат подзвігаў і здзяйсненняў для таго, каб наша краіна жыла ў міры, развівалася і мы ганарыліся яе поспехамі», — сказаў Прэм'ер-міністр.

**Паводле БелТА.**

# «МЫ АДЗІНЫЯ Ў СВАІМ ІМКНЕННІ ЖЫЦЬ У МІРЫ І ЗГОДЗЕ»

**Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з прадстаўнікамі маладзёжных арганізацый Азербайджана**

Апошнія прыбылі ў Беларусь для таго, каб паўдзельнічаць у беларуска-азербайджанскім маладзёжным форуме грамадскіх арганізацый і, адпаведна, абмяняцца вопытам супрацоўніцтва па лініі маладзёжных аб'яднанняў.



Як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, для Беларусі Азербайджан — сяброўская, братэрская краіна: «Нашы міждзяржаўныя адносіны — гэта стратэгічнае партнёрства. Вядома, у многім дзякуючы той палітыцы, якую праводзяць кіраўнікі нашых дзяржаў. Яны робяць усё для таго, каб нашы адносіны развіваліся, памнажаліся, былі ўзаемавыгаднымі, каб нашы народы сябравалі на працягу многіх гадоў».

Спікер указала на добрыя ўзаемаадносіны, якія склаліся таксама паміж парламентарыямі Беларусі і Азербайджана. «Мы выйшлі на новы ўзровень супрацоўніцтва, — удакладніла яна. — Для нас гэта вельмі важна, бо роля парламентарыяў у цяперашні час вельмі сур'ёзная. Мы павінны аб'ядноўвацца з той мэтай, каб заўсёды адстойваць суверэнітэт і незалежнасць нашых краін, адстойваць мір. Тая палітыка, якая праводзіцца ў нашых краінах, накіравана на гэта. Наша задача — працягваць рэалізоўваць тыя дамоўленасці, якія былі дасягнутыя на вышэйшым узроўні».

Па словах Наталлі Качанавай, вельмі важным з'яўляецца супрацоўніцтва па лініі маладзёжных арганізацый. «Нашы краіны будуць такімі, якімі будуць нашы маладыя людзі, якія прымуць гэту эстафету і будуць далей развіваць і нашы адносіны, і паасобку кожны сваю краіну, — заўважыла спікер. — Вы павінны сябраваць, падтрымліваць зносіны, шанаваць тую гісторыю, якая ёсць у нас».

Наталля Качанава праінфармавала прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый Азербайджана аб тым, што ў сумесным беларуска-расійскім патрыятычным культурна-асветным праекце «Цягнік Памяці» ў чарговы раз возьмуць удзел азербайджанскія школьнікі. Спікер прапанавала гасцям падумаць над рэалізацыяй сумесных праектаў, якія могуць быць цікавыя моладзі.

У завяршэнні сустрэчы Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Азербайджанска-славянскае маладзёжнае аб'яднанне падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# ТАВАРААБАРОТ РАСЦЕ, АЛЕ СПЫНЯЦЦА НЕ ТРЭБА



Тавараабарот Беларусі і Узбекістана за пяць гадоў павялічыўся ў 2,3 раза. «Але перад краінамі стаіць амбіцыйная задача, пастаўленая нашымі кіраўнікамі дзяржаў, па павелічэнні ўзаемнага тавараабароту да $1 млрд у год», — сказаў намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА на пасяджэнні сумеснай міжурадавай камісіі па двухбаковым супрацоўніцтве Беларусі і Узбекістана.

«Нашы краіны маюць агульныя падыходы да вырашэння многіх актуальных праблем сучаснасці і плённа супрацоўнічаюць у рамках міжнародных арганізацый. Узбекістан з'яўляецца адным з ключавых гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі ў Цэнтральнай Азіі. З задавальненнем хачу адзначыць, што наша партнёрства вытрымлівае выпрабаванні на трываласць — спачатку COVID-19, затым няпростая геапалітычная абстаноўка. Нягледзячы на складанасці, станоўчая дынаміка паставак сёння захоўваецца. Так, за 2020-2024 гады тавараабарот паміж нашымі краінамі павялічыўся ў 2,3 раза. Прычым рост забяспечаны з абодвух бакоў: экспарт узрос у два разы, імпарт — у 3,5 раза. Прыемна адзначыць, што гэта пазітыўная тэндэнцыя прадоўжана і сёлета», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Паводле яго слоў, работа міжурадавай камісіі зрабіла важкі ўнёсак у рост статыстычных паказчыкаў. «Сумеснымі намаганнямі нам удалося ўвасобіць у жыццё шэраг дамоўленасцяў і ідэй. У Беларусі захоўваецца ўстойлівы попыт на пастаўкі з Узбекістана неабходнай сыравіны для беларускай прамысловасці, баваўнянай пражы і трыкатажу, металапракатнай прадукцыі, вінаматэрыялу. Традыцыйным артыкулам імпарту з Узбекістана застаюцца агародніна і садавіна, якія ў сілу кліматычных умоў у нас не растуць або маюць пазнейшыя тэрміны паспявання», — звярнуў увагу Юрый Шулейка.

**Паводле БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# БЕСПІЛОТНІКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПАД КАНТРОЛЕМ

Рыхтуецца законапраект, які прадугледжвае адміністрацыйную і крымінальную адказнасць фізічных асоб за выраб і выкарыстанне гэтых апаратаў.

У Палаце прадстаўнікоў з удзелам зацікаўленых спецыялістаў абмеркавалі законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці». Праект закона, унесены ў Палату прадстаўнікоў Саветам Міністраў 30 красавіка 2025 года, рыхтуецца да першага чытання. Ён распрацаваны ў развіццё палажэнняў Указа Прэзідэнта № 297 «Аб дзяржаўным уліку і эксплуатацыі грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў». Указам прадугледжаны асаблівы парадак увозу на тэрыторыю Беларусі беспілотных лятальных апаратаў і авіямадэляў, удакладняюцца ўмовы іх захоўвання, эксплуатацыі і абароту.

Як звяртае ўвагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Андрэй ЛІС,** у цяперашні час гэтыя, як здаецца, бяскрыўдныя мірныя прадметы — беспілотнікі, авіямадэлі — актыўна ўжываюцца на тэатры ваенных дзеянняў, могуць выкарыстоўвацца для здзяйснення актаў тэрарызму і ў мэтах кантрабанды. «Таму іх бесперашкодны ўвоз на тэрыторыю краіны, абарот уяўляюць сур'ёзную пагрозу нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь», — падкрэслівае дэпутат.

Прапаноўваецца ўвесці адміністрацыйную адказнасць фізічных асоб за ўвоз, захоўванне, выраб, эксплуатацыю і абарот беспілотных лятальных апаратаў і авіямадэляў. За гэтыя дзеянні прадугледжаны сур'ёзныя штрафныя санкцыі і магчымая канфіскацыя прадметаў правапарушэння.

«Калі такія ж дзеянні будуць здзейснены вінаватай асобай на працягу года пасля прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, то надыходзіць ужо крымінальная адказнасць па артыкуле Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які распрацаваны і ўключаецца ў Крымінальны кодэкс, — удакладняе Андрэй Ліс. — Па гэтым артыкуле максімальнае пакаранне прадугледжана да двух гадоў пазбаўлення волі».

**Вераніка КАНЮТА.**

АКЦЭНТЫ

# ЗАХАВАННЕ ТЭХНАЛОГІЙ І ВАЕННАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

**Эксперты аб тым, чаму Прэзідэнт такую ўвагу ўдзяляе развіццю аграпрамысловага комплексу і як выконваюцца задачы, пастаўленыя ім**

Развіццё айчыннага аграрна-прамысловага комплексу знаходзіцца пад пастаяннай пільнай увагай кіраўніка дзяржавы. У гэтай сферы нямала дасягненняў, у краіне выпускаецца шырокая лінейка сельскагаспадарчай тэхнікі, ёсць якасныя ўгнаенні, развіваюцца сучасныя тэхналогіі... Разам з тым нельга адмаўляць, што ў АПК нямала праблем. Але яны не замоўчваюцца, а вырашаюцца пад непасрэдным кантролем Прэзідэнта, пры яго ўдзеле. Пакуль у свеце палаюць канфлікты, на якіх многія не грэбуюць нажыцца, у Беларусі працуюць, каб якаснымі прадуктамі накарміць людзей: і сваіх, і чужых. На сучасных малочнатаварных комплексах (старыя фермы адыходзяць у нябыт) працуюць як сяляне, так і сам Прэзідэнт: правядзенне выязных семінараў-нарад ужо стала добрай традыцыяй у графіку кіраўніка дзяржавы. Нашы эксперты, якія сваімі рукамі стваралі і ствараюць сельскую гаспадарку краіны, кампетэнтна растлумачылі, чаму непасрэдны ўдзел Прэзідэнта ў развіцці АПК — не фармальная, а плённая праца, якая дае эфектыўны вынік.

## «БЕЗ ТЭХНАЛОГІЙ І ДЫСЦЫПЛІНЫ ДАСЯГНУЦЬ ПОСПЕХАЎ НЕМАГЧЫМА»



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Аляксандр БАГЕЛЬ** звярнуў увагу на тое, што ўсе рашэнні, якія ў розны час прымаў Прэзідэнт, сведчаць: шлях, па якім ідзе наша краіна, быў выбраны правільна. «Без тэхналогій і дысцыпліны дасягнуць поспехаў у сельскай гаспадарцы складана, нават немагчыма, — лічыць ён. — Калі будзем рабіць усё так, як навука рэкамендуе, зыходзячы са свайго жыццёвага досведу, тады ў нас усё атрымаецца. Пытанні, праблемы патрэбна вырашаць у комплексе, тады будзе эфект».

Сельгаспрадпрыемства «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» ідзе ў нагу з часам. Нядаўна быў пабудаваны сучасны малочнатаварны комплекс, што дазволіла атрымліваць 30 кілаграмаў малака ад каровы за суткі. Пры гэтым, як дадаў Аляксандр Багель, рэзервы яшчэ ёсць. «У прыярытэце, вядома, — людзі, — лічыць ён. — Трэба даваць ім магчымасць і зарабіць, і адпачыць. Адток кадраў на прадпрыемстве мы ўжо спынілі. Спадзяёмся, што павелічэнне заработнай платы паўплывае на прыток кадраў. Многае робіць тэхніка, але без людзей ніяк».

Сенатар заўважыў, што асаблівай увагі патрабуе кармавая база. Па яго словах, без гэтага не будзе выніку і ў іншых кірунках. «І захаванасць жывёлы ў многім залежыць ад таго, якія кармы, — канкрэтызаваў Аляксандр Багель. — У гэтым плане важную ролю іграе збалансаваны рацыён. У нашай гаспадарцы мы перайшлі на бабовыя культуры, у асноўным люцэрну: яна дае больш укосаў, і ўраджайнасць добрая. Мы праводзім лабараторныя даследаванні, каб мець аб'ектыўную карціну збалансаванасці нашых кармоў. Гэта дае свой эфект».

Яшчэ адным немалаважным аспектам у жывёлагадоўлі, па словах члена Савета Рэспублікі, з'яўляецца прафілактыка захворванняў у жывёл. «Наша ветэрынарная служба практычна ўкамплектавана, забяспечваем яе на 100 % патрэбнымі вакцынамі і прэпаратамі, бо без гэтага таксама нельга дабіцца добрага выніку», — рэзюмаваў ён.

## «ГОДНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ПРАЦЫ СТВОРАНЫ — ТОЛЬКІ ПРАЦУЙ»



Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Іван МАРКЕВІЧ,** з першых дзён прэзідэнцтва Аляксандр Лукашэнка асаблівую ўвагу ўдзяляе сельскай гаспадарцы. «Працуючы ў галіне з 1992 года, я ўвесь гэты час назіраў, як паступова рухалася наперад сельская гаспадарка, — канкрэтызаваў ён. — Безумоўна, на гэта паўплывала і стварэнне аграгарадкоў, і будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці, дзякуючы чаму мы захавалі сельскую гаспадарку, захавалі кадры. Магчыма, дзесьці і ёсць кадравы дэфіцыт, але там, дзе добрыя гаспадаркі — рэнтабельныя, тэхналагічныя, людзі замацаваліся, працуюць і атрымліваюць добры вынік».

Вынікам гэтага, па словах парламентарыя, стала стабільнасць харчовай бяспекі Беларусі. «Акрамя таго, больш як на 8 мільярдаў долараў мы экспартуем высакаякаснай прадукцыі, перапрацаванай з добрай сыравіны з дабаўленай вартасцю, — дадаў Іван Маркевіч. — Наведваючы Ваўкавыск, ААТ «Беллакт», кіраўнік дзяржавы яшчэ раз пераканаўся, што на прыкладзе такіх прадпрыемстваў, дзе вялікая дабаўленая вартасць, сёння трэба развіваць і будаваць прадпрыемствы далей. А чаму б не пабудаваць яшчэ адзін такі завод, як «Беллакт»? І лагістыка добрая, і кадры ёсць. Упэўнены, што гэта атрымаецца».

Кажучы аб семінары-нарадзе, які з удзелам Прэзідэнта напярэдадні прайшоў на базе аднаго з малочнатаварных комплексаў філіяла «Астрашыцкі Гарадок» ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», дэпутат адзначыў, што Аляксандр Лукашэнка неаднойчы засяроджвае ўвагу на тэме падзяжу жывёлы, шчыра перажывае наконт гэтай праблемы. «Так, прычыны ёсць: і безгаспадарлівасць, і няўважлівасць кадраў на месцах, але ж мы губім маладняк, дарослых жывёл, — канкрэтызаваў парламентарый. — Таму галоўная задача сёння — выходзіць на тэхналагічны ўзровень. Як кажа Прэзідэнт, на дыктатуру дысцыпліны. Вось гэта галоўнае. На прыкладзе малочнатаварнага комплексу агракамбіната «Дзяржынскі» мы яшчэ раз пераканаліся ў тым, што такія фермы патрэбна будаваць у краіне. Гэта і сабекошт, і ўмовы, у якіх прыемна працаваць людзям, і самае галоўнае — якасная прадукцыя».

Па словах дэпутата, Прэзідэнт занепакоены кармавой базай. «На працягу многіх гадоў Аляксандр Рыгоравіч гаворыць, што жывёлу трэба карміць якаснымі кармамі, тады атрымаецца добры вынік, — заўважыў Іван Маркевіч. — Калі гэта ў гаспадарках, раёнах выконваецца, то кіраўнікі знаходзяцца на сваім месцы. Тады і вынік ёсць: і свой рынак забяспечым якаснай прадукцыяй, і будзем яе экспартаваць».

## «ТОЛЬКІ СВАЁЙ ПРАЦАЙ, СТАРАННАСЦЮ МЫ ЗМОЖАМ АБАРАНІЦЬ НАШУ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І СУВЕРЭНІТЭТ»



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Антон КУЛІСЕВІЧ** большую частку жыцця пражыў у вёсцы і бачыў, як развівалася сельская гаспадарка. «Усе праграмы па развіцці сяла (у прыватнасці будаўніцтва аграгарадкоў) найперш дазволілі стварыць нармальныя ўмовы для жыцця нашага насельніцтва ў сельскай мясцовасці, — лічыць дэпутат. — Сёння без інтэнсіўных тэхналогій, інавацый, якія ўкараняюцца ў сельскую гаспадарку, працаваць ужо немагчыма адназначна. Няма сёння тых соцень людзей, якія выходзілі і ўручную ўбіралі цукровыя буракі, бульбу. Многае вырашае тэхніка, і тут з боку дзяржавы шмат што робіцца».

Парламентарый звярнуў увагу на словы Прэзідэнта аб тым, што сёння можна вырабіць усё што заўгодна, галоўнае — прадаць. «Беларусь поўнасцю забяспечвае сябе прадуктамі харчавання, але сёння сельская гаспадарка — гэта яшчэ і бізнес, — адзначыў Антон Кулісевіч. — На экспарце сельскагаспадарчай прадукцыі наша краіна зарабляе добрыя грошы. А шмат грошай не бывае для краіны. Чым больш мы будзем прадаваць, тым больш будзе якасці, тым лепш будзе жыць наша краіна. Прэзідэнт правільна гаворыць: калі не будзем працаваць, значыць, будзе ў нас вайна. Бо толькі сваёй працай, стараннасцю мы зможам абараніць нашу незалежнасць і суверэнітэт».

Антон Кулісевіч на працягу 12 гадоў працаваў старшынёй Бераставіцкага райвыканкама, дагэтуль чатыры гады займаў пасаду начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі, таму не па чутках ведае, як развівалася сельскагаспадарчая галіна. «Калі я прыйшоў у раён у 2006 годзе, было толькі дзве фермы з даільнымі заламі, — канкрэтызаваў ён. — Калі сыходзіў з раёна, засталася адна невялікая фермачка, дзе яшчэ ёсць лінейная дойка. Усе астатнія (ужо малочнатаварныя комплексы) працуюць па сучасных тэхналогіях. На адным з такіх комплексаў у 2023 годзе пабываў наш Прэзідэнт».

Па словах парламентарыя, у Бераставіцкім раёне ўжо тады зразумелі, што будаваць у чыстым полі новую ферму вельмі дорага. «І днямі кіраўнік дзяржавы казаў аб тым, што неабавязкова будаваць новыя, шыкоўныя малочнатаварныя комплексы, можна таннейшым спосабам палепшыць утрыманне жывёлы, а таксама ўмовы працы людзей, — канстатаваў Антон Кулісевіч. — Вядома, на гэта ўплывае і выкарыстанне энерганасычаных трактароў, камбайнаў. Мы сёння меншай колькасцю тэхнікі выконваем большы аб'ём працы. Усё гэта адбіваецца на заработнай плаце. Жывёлаводы, даяркі, якія добрасумленна працуюць, атрымліваюць звыш чатырох тысяч беларускіх рублёў. Калі б людзі не хацелі працаваць, то, напэўна, не было б такіх вынікаў».

Па словах дэпутата, не трэба баяцца давяраць кіруючыя пасады маладым перспектыўным людзям і варта прытрымлівацца дысцыпліны, без якой нічога не будзе.

## ПА ФОРМУЛЕ «ЧАТЫРЫ «К»



**Алег БУРАК, дырэктар адной з вядучых гаспадарак краіны — ААТ «Астрамечава» Брэсцкага раёна,** разумее сутнасць і глыбіню задач, якія ставіць перад аграрыямі Прэзідэнт. «Наша задача сёння — не толькі накарміць краіну, але і зарабіць грошай на сацыяльныя патрэбы, на далейшае развіццё, — адзначае ён. — Мадэрнізацыя, паляпшэнне жывёлагадоўчай галіны праводзіцца ў краіне паўсюль. Значыць, аснова ёсць, і тут на першы план выходзяць арганізацыя работы, вытворчая дысцыпліна. Нездарма ж Аляксандр Рыгоравіч параўноўвае яе з дысцыплінай ваеннай».

«Гэта мы адчуваем штодня і на сваёй гаспадарцы, — дзеліцца кіраўнік уласным досведам. — Як толькі адпусціш кантроль, аслабіш дысцыпліну, вынікі дадуць пра сябе знаць. Нездарма ж мы ўжо даўно на службу вытворчасці паставілі інфарматызацыю. Цяпер з майго кабінета, кабінетаў іншых кіраўнікоў можна ў рэжыме анлайн адсочваць усе вытворчыя працэсы, у тым ліку на жывёлагадоўчых аб'ектах».

Сёння ў «Астрамечаве» 16 860 галоў буйной рагатай жывёлы, па надоях перасягнулі 10-тысячную мяжу. Штогод сельгаспрадпрыемства дае краіне сотні тон ялавічыны. «Кожны год укладваем сродкі ў далейшае развіццё галіны з бачаннем перспектывы, — расказвае Алег Бурак. — Поспех звязваем з дасканалым функцыянаваннем механізму па формуле, якую назвалі «Чатыры «К»: кадры, каровы, кармы, камфорт».

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

КАМПЕТЭНТНА

# ДЗЕЦІ ПАВІННЫ ХАДЗІЦЬ У ШКОЛУ — ГЭТА НОРМА

**Міністр адукацыі пракаментаваў важныя новаўвядзенні, якія чакаюцца ў сферы з 1 верасня**

З новага навучальнага года выключаецца дыстанцыйнае навучанне дзяцей, якія жывуць у Беларусі, у замежных установах агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама магчымасць ІП рэалізоўваць вучэбныя праграмы дашкольнай адукацыі.



## «ЗНАЁМІЦЬ З ГІСТОРЫЯЙ РАДЗІМЫ»

Міністр адукацыі Андрэй Іванец, адказваючы на пытанне карэспандэнта БелТА, пракаментаваў норму, што выключае навучанне ў дыстанцыйнай форме дзяцей, якія пражываюць у Беларусі, у замежных установах агульнай сярэдняй адукацыі.

Кіраўнік адукацыйнага ведамства адзначыў, што так званы «ўсенавуч» у краіне рэалізоўваецца на працягу многіх гадоў, а анлайн-навучанне (дыстанцыйнае) на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі і зусім не прадугледжана.

«З 1 верасня ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі ўсе рабяты — нашы грамадзяне павінны будуць атрымліваць агульную сярэднюю адукацыю ў нашых школах. Гэта толькі фармалізацыя тых рашэнняў, якія былі прыняты раней. Гаворка ідзе аб тым, што з 1 верасня 2022 года агульная сярэдняя адукацыя стала абавязковай для нашай краіны. Таксама мы гаворым пра тое, што атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю не толькі ў школе, заканчваючы 11 класаў, але і ў каледжах, праграмы якіх для тых, хто паступіў пасля 9-х класаў, таксама ўключаюць у сябе адпаведны школьны складнік. Усё гэта неабходна для таго, каб найперш знаёміць дзяцей з гісторыяй сваёй краіны, Радзімы», — сказаў Андрэй Іванец.

Уведзеная норма накіравана на выключэнне навучання дзяцей, якія жывуць у Беларусі, дыстанцыйна ў замежных установах адукацыі.

**«У нашых школах ёсць гісторыя Беларусі, геаграфія Беларусі, беларуская мова, беларуская літаратура. Усіх гэтых прадметаў, абсалютна відавочна, няма як у вочных, так і ў анлайн-школах, якія знаходзяцца за межамі нашай краіны. Таму я думаю, што гэта абсалютна спакойная норма.**

Тут мы разлічваем на тое, што кожны з бацькоў, кожны грамадзянін нашай краіны адказна ставіцца і да выхавання, і да навучання сваіх дзяцей», — падкрэсліў міністр.

У ведамстве адзначылі, што, калі дзіця зарэгістравана ў Беларусі, але выехала на часовае пражыванне ў іншую дзяржаву, абавязак атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў школах, гімназіях, ліцэях Беларусі на яго не распаўсюджваецца. Бацькам будучых першакласнікаў, зарэгістраваных у Беларусі, але якія пражываюць за яе межамі, падаваць у школу пацвярджальныя дакументы не трэба.

## «МОГУЦЬ ТОЛЬКІ ЮРАСОБЫ»

Міністр адукацыі таксама расказаў журналістам, чаму з 1 верасня ІП не будуць рэалізоўваць вучэбныя праграмы дашкольнай адукацыі.

Андрэй Іванец адзначыў, што пасля ўступлення ў сілу закона аб ліцэнзаванні з 1 верасня 2022 года не было ніводнай заяўкі ў ліцэнзавальныя органы ад індывідуальных прадпрымальнікаў.

«Не звярталіся на прадмет атрымання ліцэнзіі для ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці на ўзроўні дашкольнай адукацыі. Гэта сведчыць аб тым, што фактычна за тры гады ні адзін індывідуальны прадпрымальнік не змог выканаць тыя патрабаванні, якія прад'яўляюцца для таго, каб ажыццяўляць гэту праграму. Таму шмат у чым дадзеная норма Кодэкса аб адукацыі толькі фармалізуе тое, што сёння ў нас могуць ажыццяўляць дадзеныя праграмы як дзяржаўныя, так і прыватныя ўстановы адукацыі, але ІП да іх не адносяцца»,— праінфармаваў Андрэй Іванец.

Паводле яго слоў, усё заканамерна. «Мы цудоўна разумеем, што наяўнасць педагагічнага калектыву, які мае адпаведную адукацыю, патрэбных плошчаў, якія адказваюць санітарным, супрацьпажарным нормам, нормам бяспекі знаходжання нашых дзяцей ва ўстанове, а таксама забеспячэнне неабходных умоў для дзённага знаходжання, харчавання і пасляабедзеннага сну пад сілу выканаць толькі юрыдычным асобам, якія не адносяцца да індывідуальных прадпрымальнікаў».



# «НА АДНАГО ВЫПУСКНІКА — АД ТРОХ НАЙМАЛЬНІКАЎ...»

## СТАЎКА НА ІНЖЫНЕРАЎ

Сёлета ўпершыню ў БДСГА паступаюць выпускнікі інжынерных класаў.

— Праца на вёсцы становіцца лягчэйшай, яна ганаровая і цікавая, — кажа **рэктар установы Віталь ВЕЛІКАНАЎ.** — У сельскай гаспадарцы маладога спецыяліста хутчэй заўважаць. Парадокс: спецыяльнасці «аграном», «заатэхнік», якія запатрабаваныя ў эканоміцы краіны, не самыя папулярныя ў абітурыентаў. І гэтых кадраў не хапае. Хоць працаваць ужо не так складана, як раней. З кожным годам сельскагаспадарчая тэхніка становіцца ўсё больш дасканалай і тэхналагічнай. Мы арыентуемся на тое, каб нашы студэнты валодалі найноўшымі тэхналогіямі. Працуем у тандэме з тэхнапаркам «Горкі», дзе якарным рэзідэнтам з'яўляецца ТАА « Тэхналогіі земляробства». На базе акадэміі яны адкрылі некалькі сваіх лабараторый. Разам праводзім работу па павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў сельскагаспадарчага профілю. У нас дзейнічае больш як 40 лабараторый і цэнтраў, аснашчаных сучасным абсталяваннем. Штогод мы ўводзім у дзеянне новыя аб'екты або абнаўляем тыя, што існуюць.

## ВЕДЫ ПАЦВЯРДЖАЮЦЦА ПРАКТЫКАЙ

ВНУ рыхтуе спецыялістаў па ўсіх спецыяльнасцях, запатрабаваных у АПК, акрамя ветэрынарнай медыцыны.

— На кожнага выпускніка пры размеркаванні паступае тры і больш прапаноў ад прадпрыемстваў, — адзначае рэктар.

У акадэміі практыка-арыентаванае навучанне. Студэнты працуюць на розных участках — у вучэбна-доследнай гаспадарцы акадэміі, на рыбаводным комплексе, сельгаспрадпрыемствах вобласці. Да паслуг будучых аграрыяў 280 гектараў доследных палёў БДСГА, дзе вядуцца навуковыя даследаванні.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар.)*

Вельмі запатрабаваныя студэнты інжынернага профілю, якія працуюць у складзе мехатрадаў. «Як толькі пачынаецца пасяўная, ідзе па некалькі заявак на аднаго юнака, — адзначае рэктар ВНУ. — Хлопцы здаюць сесію і — у поле. Яны задзейнічаныя і падчас уборачнай кампаніі, працуюць на нарыхтоўцы кармоў.

«Фішка» акадэміі — супрацоўніцтва з Расіяй і Кітаем, дзе студэнты праходзяць стажыроўкі.

— Шчыльна працуем з кітайскім Паўночна-Заходнім універсітэтам сельскай і лясной гаспадаркі, — звяртае ўвагу Віталь Веліканаў. — Некалькі гадоў запар у Горках стажыруюцца кітайскія магістранты. На нашых доследных палях выпрабоўваюцца розныя сарты кітайскай мяккай пшаніцы. Атрыманы сумесны сорт пшаніцы, які цяпер праходзіць выпрабаванне на дзяржаўным узроўні.

## СВОЙ КАДР ХУТЧЭЙ ЗАМАЦУЕЦЦА

Здавалася б, з такімі ўмовамі навучання, з гарантаваннем працоўнага месца знайсці чатыры сотні «мэтавікоў» з улікам аграрных класаў, якіх у маштабах краіны не адзін дзясятак, няма праблем. Але, як кажуць, ёсць нюансы.

Як сведчыць Віталь Веліканаў, толькі 20 % выпускнікоў аграрных класаў выбіраюць сельскагаспадарчыя спецыяльнасці. Астатнія аддаюць перавагу іншым установам, часцей за ўсё медыцынскага профілю (у гэтых класах на ўзроўні вывучаецца хімія і біялогія). А значыць, рабіць стаўку толькі на гэты «рэзерв» не прыходзіцца.

— Дасягнуць вынікаў па мэтавай падрыхтоўцы можна толькі пры сумеснай рабоце ВНУ і заказчыка кадраў, — лічыць суразмоўнік. — Вельмі часта ў аграрныя класы ідуць дзеці больш зацікаўленыя падцягнуць хімію і біялогію, на якія тут робіцца акцэнт. Пры гэтым многія з іх далёкія думкамі ад сельскай гаспадаркі.

За кожнай кафедрай аграрнай ВНУ замацаваныя раёны, дзе выкладчыкі вядуць прафарыентацыю. Яны ездзяць у школы, упраўленні адукацыі, на злёты, у агракласы — расказваюць пра відавочныя плюсы. У «мэтавікоў» іх асабліва шмат. Акрамя таго, што яны паступаюць без экзаменаў, яшчэ і атрымліваюць бонус да стыпендыі ў выглядзе ад 5 да 10 базавых велічынь ад тых сельгаспрадпрыемстваў, куды пойдуць працаваць.



— З намі добра супрацоўнічае шэраг вядомых у Беларусі сельгаспрадпрыемстваў, і з кадрамі там усё добра, — рэзюмуе Віталь Веліканаў. — Але ёсць такія, дзе з кадрамі праблема, а «мэтавікоў» да нас не накіроўваюць. Потым прыязджаюць і просяць размеркаваць спецыялістаў. Мы не супраць. Нават калі студэнт вучыцца на апошнім курсе, можам аформіць мэтавы дагавор. Але і нам, і гаспадарцы лепш, калі яны прысылаюць свайго чалавека. І ён ужо з першага года вучобы мэтанакіравана едзе на практыку ў гэту гаспадарку. Звычайна з іншых абласцей на новым месцы рэдка хто прыжывецца, а свой кадр хутчэй замацуецца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**

АБІТУРЫЕНТ-2025

# І ВЫКЛАДЧЫК, І ПЕРАКЛАДЧЫК

**Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна адкрывае набор па дзвюх новых спецыяльнасцях**

На факультэце прыродазнаўства з гэтага навучальнага года будуць рыхтаваць спецыялістаў па двух новых кірунках. Адзін з іх называецца «краіназнаўства і перакладчыцкая дзейнасць», другі — «мікрабіялогія», паведаміў рэктар ВНУ Юрый ГОЛУБЕЎ.



Па спецыяльнасці «краіназнаўства і перакладчыцкая дзейнасць» тэрмін навучання складзе чатыры з паловай года. Для паступлення патрэбны вынікі ЦТ альбо ЦЭ па беларускай ці рускай мове, геаграфіі і матэматыцы. А выпускнікам будзе прысвоена трайная спецыяльнасць — географ, выкладчык, перакладчык.

Ва ўніверсітэце адзначылі, што адкрыццё адукацыйнага кірунку з такім шырокім спектрам ведаў прадыктавана жыццём. Часта вясковыя, пасялковыя, нават школы малых гарадоў адчуваюць дэфіцыт настаўнікаў геаграфіі, замежных моў. Такі ўніверсальны спецыяліст зможа выкладаць адразу некалькі прадметаў. А яшчэ падобнымі кадрамі могуць зацікавіцца прадпрыемствы, што вядуць знешнеэканамічную дзейнасць — лічаць у ВНУ.

Прафесіяналы ў галіне мікрабіялогіі таксама цяпер надзвычай запатрабаваныя. Для таго каб атрымаць кваліфікацыю «мікрабіёлаг», належыць здаць адну з дзяржаўных моў, біялогію і хімію ды адвучыцца чатыры гады. Выпускнікоў з задавальненнем запросяць прадпрыемствы перапрацоўчага комплексу, а таксама фармацэўтычныя кампаніі.

Дарэчы, падрыхтоўка настаўнікаў з'яўляецца галоўным профілем дзейнасці дадзенай вышэйшай навучальнай установы. Каля 80 % выпускнікоў атрымліваюць педагагічныя спецыяльнасці. Як адзначыў рэктар, набор на іх апошнім часам узрастае ў адпаведнасці з попытам на кадры. Летась, напрыклад, прыём істотна павялічылі, а сёлета плануецца набраць яшчэ больш студэнтаў. Асаблівая ўвага цяпер удзяляецца прыродазнаўчым навукам. Плануецца стварэнне Цэнтра кампетэнцый у галіне прыродазнаўчай адукацыі.

Усяго на дзевяці факультэтах брэсцкага ўніверсітэта навучаецца 4,5 тысячы студэнтаў. Сёлета абітурыентаў набіраюць па 20 спецыяльнасцях.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЯШЧЭ МОЖНА ПАСПЕЦЬ

**Сёння пачынаюцца цэнтралізаваныя рэзервовыя іспыты**

Для тых, хто па ўважлівых прычынах не змог прайці ЦЭ і ЦТ разам з усімі, шанц нагнаць астатніх прадставіцца 19, 21 і 23 чэрвеня. У гэтыя дні абітурыентаў на выпрабаванні будзе чакаць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У выпрабаваннях прымуць удзел 671 чалавек, з іх у цэнтралізаваным экзамене — 242 (у 2024 годзе — 227), у цэнтралізаваным тэсціраванні — 429 (у 2024-м — 395).

19 чэрвеня можна напісаць тэст па любым прадмеце, але толькі тым, хто прапусціў па ўважлівай прычыне ЦТ. 21 чэрвеня можна напісаць тэст па профільным прадмеце тым, хто прапусціў альбо ЦЭ, альбо ЦТ у асноўныя дні. 23 чэрвеня напішуць тэставыя ЦЭ і ЦТ па рускай або беларускай мове. Самым масавым прадметам па колькасці зарэгістраваных у рэзервовыя дні на ЦЭ з'яўляецца руская мова — 108 чалавек, а сярод профільных прадметаў — грамадазнаўства, якое напішуць 50 чалавек.

На ЦТ больш за ўсё чакаецца абітурыентаў на рускай мове — 106, а сярод профільных прадметаў — на матэматыцы, з колькасцю 78 абітурыентаў. Ва ўсе дні ў БДУ ЦЭ і ЦТ будуць праводзіцца толькі ў адным корпусе — юрыдычным. Задзейнічаны 10 аўдыторый. Для працы ў якасці арганізатараў прыцягнуць больш за 70 выкладчыкаў БДУ.

Тым часам учора сталі вядомыя вынікі другога з двух асноўных дзён правядзення цэнтралізаванага тэсціравання — 5 чэрвеня 2025 года. У гэты дзень у цэнтралізаваным тэсціраванні па 4 профільных вучэбных прадметах (фізіцы, хіміі, гісторыі Беларусі і грамадазнаўстве) удзельнічалі 29,2 тысячы абітурыентаў.

Максімальна магчымы вынік — 100 балаў — удалося атрымаць 99 абітурыентам, у тым ліку 35 — па грамадазнаўстве, 46 — па хіміі, 11 — па фізіцы, 7 — па гісторыі Беларусі. Сярэдні тэставы бал па грамадазнаўстве — 59,8 бала, па фізіцы — 55,2, па гісторыі Беларусі — 53,8, па хіміі — 48,9 бала. Сертыфікаты ЦТ абітурыенты змогуць атрымаць з 1 ліпеня ў пунктах правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, дзе яны прымалі ўдзел.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

ПА СУТНАСЦІ СПРАВЫ

# АГРАКЛАСЫ, ЦЭНТРЫ КАМПЕТЭНЦЫІ І СУЧАСНЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Як павысіць якасць і прэстыж аграрнай адукацыі? Якія новаўвядзенні плануюцца ў праграмы навучання і падрыхтоўкі будучых спецыялістаў? Якія прафесіі найбольш запатрабаваныя? Якія матэрыяльныя стымулы і гарантыі прадугледжаны для маладых спецыялістаў аграрных прафесій? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да начальніка Галоўнага ўпраўлення адукацыі, навукі і кадравай палітыкі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Уладзіміра САМСАНОВІЧА.

— Прафесіяналы з вопытам работы на зямлі былі запатрабаваныя ва ўсе часы. Я згодны, быў перыяд, калі аграрнаму комплексу краіны было цяжка канкурыраваць з іншымі галінамі з-за некаторых фактараў, такіх як зарплата, умовы працы і некаторыя іншыя, — сказаў наш суразмоўца. — Але цяпер сітуацыя змянілася — прыкметна выраслі даходы ў галіне, гэтак жа прыкметна палепшыліся ўмовы працы і сацыяльнага асяроддзя ў вёсцы.

Але работа ў гэтым кірунку павінна працягвацца, лічыць спецыяліст, і каб новыя кадры прыходзілі ў галіну, а ўжо дзеючыя працягвалі працаваць, імідж аграсектара павінен стаць яшчэ больш прывабным.

— Таму, разумеючы важнасць падрыхтоўкі кадраў для вёскі, на дзяржаўным узроўні пастаянна прымаюцца меры, накіраваныя на павышэнне прэстыжу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў. І, паверце, такіх прэферэнцый няма ні для якой іншай галіны, — падкрэсліў прадстаўнік ведамства.

Ён выказаў перакананне ў тым, што адным з важных кірункаў развіцця аграрнай адукацыі з'яўляецца павышэнне якасці практыкаарыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў.

— Мінсельгасхарч сумесна з аграрнымі ВНУ і заказчыкамі кадраў вядзе пастаянную работу па абнаўленні вучэбных планаў і праграм, павышэнні прафесійнага ўзроўню педагагічных кадраў, развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, максімальным збліжэнні навучальнага працэсу з вытворчасцю. Практычныя і лабараторныя заняткі, навучальныя і вытворчыя практыкі ў агульным аб'ёме вучэбных гадзін на падрыхтоўку спецыялістаў складаюць каля 60—70 %, — канстатуе Уладзімір Самсановіч.

З першага курса студэнты замацоўваюцца за канкрэтнымі сельгасарганізацыямі, у якіх праходзяць практыку ў перыяд навучання, а пасля заканчэння вучобы там жа і працаўладкоўваюцца. Для моладзі, па словах суразмоўцы, гэта каштоўны вопыт, які дазваляе павысіць якасць іх практычнай падрыхтоўкі і дапаможа хутка і беспраблемна адаптавацца ў калектыве. Спыніўся прадстаўнік сельскагаспадарчага ведамства і на мэтавым навучанні, назваўшы яго важным кірункам у рабоце па падрыхтоўцы кадраў.

— Гэта вялікая дапамога для ўстаноў адукацыі і добры бонус для студэнтаў, калі арганізацыі — заказчыкі кадраў, якія накіроўваюць абітурыентаў на навучанне па мэтавых дагаворах, устанаўліваюць для іх даплаты да стыпендый на перыяд навучання, удзельнічаюць у іх практычнай падрыхтоўцы ў перыяд праходжання вытворчай і пераддыпломнай практык і гарантуюць працоўнае месца на пяць гадоў, — расказаў пра прэферэнцыі мэтавай траекторыі навучання Уладзімір Самсановіч.

Аграрныя класы ва ўстановах адукацыі пачалі адкрывацца ў краіне з 2018 года. Па словах прадстаўніка ведамства, за сем гадоў іх колькасць значна павялічылася.

— Профільных класаў было адкрыта нямала, — працягвае суразмоўца. — Сёння ў 521 установе агульнай сярэдняй адукацыі функцыянуе 728 агракласаў, колькасць навучэнцаў якіх налічвае звыш 5 тысяч школьнікаў.

Факт, па словах прадстаўніка Мінсельгасхарча, пазітыўны. І хоць кадравая праблема ў АПК пакуль цалкам не вырашана, ёсць надзея на тое, што маладыя людзі, прайшоўшы некалькі прыступак навучання аграрнай спецыяльнасці, выберуць яе справай свайго жыцця.

— Так сёння і адбываецца, — гаворыць ён. — Выпускнікі агракласаў паступаюць у ВНУ, каледжы — гэта тыя маладыя людзі, якія вывучылі сельскагаспадарчую вытворчасць знутры, прызналі яе і прынялі рашэнне прыйсці ў аграрны сектар. Менавіта з іх, як я лічу, атрымаюцца высакакласныя спецыялісты, якія застануцца ў галіне, будуць сваім прыкладам прыцягваць у яе іншых спецыялістаў і, такім чынам, стануць фарміраваць яе будучыню.

Уладзімір Самсановіч адзначае, што аграрныя ВНУ і каледжы пастаянна актуалізуюць праграмы навучання і падрыхтоўкі будучых рабочых і спецыялістаў: «Гэтага патрабуе маштабная мадэрнізацыя аграпрамысловага комплексу, рэканструкцыя і будаўніцтва сучасных МТК і перапрацоўчых прадпрыемстваў», — падсумоўвае ён.

Па словах Уладзіміра Самсановіча, каб адпавядаць патрабаванням сучаснасці, аграрныя ВНУ краіны ў 2025—2026 навучальным годзе адкрываюць новыя спецыяльнасці, накіраваныя на развіццё лічбавых тэхналогій, аўтаматызацыі і рабатызацыі ў аграпрамысловым комплексе, а таксама падрыхтоўку спецыялістаў у галіне сэрвісу і інжынірынгу сельгастэхнікі і абсталявання. Акрамя таго, будуць развівацца кірункі, звязаныя з энергетычным забеспячэннем сельскай гаспадаркі, аўтаматызацыяй тэхналагічных працэсаў і тэхнічным сэрвісам. Сваю ролю ў падрыхтоўцы высакакласных спецыялістаў, на думку прадстаўніка Мінсельгасхарча, сыграюць і цэнтры кампетэнцыі ў сельскай гаспадарцы, якія ёсць у кожнай вобласці: у профільных каледжах у Смілавічах, Драгічыне, Жыровічах, Оршы, Жлобіне, Калінкавічах, Гарадку і Магілёве. Іх базай карыстаюцца ўсе профільныя каледжы.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

**БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ**
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

**www.tcbank.by**

## Консолидированный отчет о финансовом положении

| | Прим. | 31 декабря 2024 г. | 31 декабря 2023 г. |
|---|---|---|---|
| **Активы** | | | |
| Денежные средства | 7 | 2 782 | 3 120 |
| Средства в Национальном банке | 8 | 4 372 | 3 274 |
| Средства в банках | 9 | 138 535 | 132 938 |
| Кредиты и иные активные операции с клиентами | 11 | 38 558 | 22 767 |
| Ценные бумаги | 12 | 3 290 | 11 010 |
| Основные средства | 13 | 4 264 | 3 408 |
| Инвестиционная недвижимость | 14 | 79 365 | 75 387 |
| Нематериальные активы | 15 | 1 287 | 558 |
| Отложенные налоговые активы | 20 | 2 415 | 1 283 |
| Предоплата по налогу на прибыль | | - | 40 |
| Прочие активы | 16 | 1 222 | 670 |
| **Итого активы** | | **276 090** | **254 455** |
| **Обязательства** | | | |
| Средства банков | 17 | 10 915 | 6 175 |
| Средства клиентов | 18 | 9 604 | 6 981 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | | - | 18 |
| Отложенные налоговые обязательства | | 7 785 | 6 648 |
| Прочие обязательства | 19 | 870 | 517 |
| **Итого обязательства** | | **29 174** | **20 339** |
| **Собственный капитал** | | | |
| Зарегистрированный уставный фонд | 21 | 61 651 | 61 651 |
| Эффект гиперинфляции уставного фонда, эмиссионного дохода | 21 | 127 324 | 127 324 |
| Эмиссионный доход | | 61 | 61 |
| Результаты переоценки статей баланса и резервы | | 2 784 | 2 090 |
| Накопленная прибыль (убыток) | | 55 096 | 42 990 |
| **Итого собственный капитал** | | **246 916** | **234 116** |
| **Итого собственный капитал и обязательства** | | **276 090** | **254 455** |

## Консолидированный отчет о совокупном доходе

| | Прим. | 2024 | 2023 |
|---|---|---|---|
| Процентные доходы, рассчитанные с использованием эффективной процентной ставки | 23 | 16 870 | 14 272 |
| Прочие процентные доходы | 23 | - | 100 |
| Процентные расходы, рассчитанные с использованием эффективной процентной ставки | 23 | (23) | (62) |
| **Чистые процентные доходы** | **23** | **16 847** | **14 310** |
| Доходы по уменьшению оценочных резервов по финансовым активам | | 1 889 | 681 |
| **Чистые процентные доходы после уменьшения оценочных резервов по финансовым активам** | | **18 736** | **14 991** |
| Доходы за услуги | 24 | 955 | 980 |
| Расходы за услуги | 24 | (188) | (270) |
| **Чистые доходы за услуги** | **24** | **767** | **710** |
| Чистые доходы/(расходы) от операций с иностранной валютой | 25 | (418) | 1 051 |
